# ТЭКСТ ДЛЯ ВОДГУКУ

## МОЖА – ПРАБ’ЕЦЦА

У лясным зацішку, у ценю між сосен, уразіў кволы парастак. Чатыры адмыслова выразаныя пляскатыя лісты, падобныя на прапелер. Сцяблінка – тонкая, кволая, танчэй за жытнюю – аж дзівішся, як яна трымае такія шырокія лісты!

З захапленнем падумалася, што з такіх вырастаюць волаты-дубы. З такога пачынаецца цар лесу! Пройдзе час і – уздымецца, узнясецца над зямлёй, над дрэвамі, магутна раскіне вузлаватае, нібы ўсё ў мускулах, галлё…

За захапленнем прыйшоў абачлівы одум: не, мусіць, на гэты раз цуда не будзе: пэўна, не будзе з гэтага парастка волата-дуба. Вельмі ж моцна ўраслі ў зямлю, спляліся карэннем, галлём сосны. Дружныя, дужыя, акружылі з усіх бакоў, захапілі зямлю, засланілі неба. Не дадуць разрасціся, не пусцяць...

Не хочацца верыць у такое. Бярэ нязгода, упартасць: а можа – праб’ецца, узнясецца? Усё ж ён не проста парастак, ён – зерне волата.

*Іван Мележ*

*з цыкла “Белыя вішні і яблыні” (1976)*